




## ЗАХАВАЕМ РАЗАМ ТВП "БРЫЦАЛАВІЦКАЯ ПУШЧА"!

Калі Вам неабыякавы лёс прыроды роднага краю, калі Вы маеце магчымасць наведваць Брыцалавіцкую пушчу і кантраляваць яе стан або жадаеце іншым чынам садзейнічаць яе ахове, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП "Брыцалавіцкая пушча" і разам з намі паклапаціцца аб яе існаванні ў будучым.

**Захавальнікам ТВП можа стаць кожны аматар прыроды незалежна ад узросту, прафесіі і асабістых здольнасцей. З дапамогай захавальнікаў мы рэгулярна і аператыўна атрымліваем інфармацыю пра стан ТВП і пагрозы, якія на іх узнікаюць, праводзім практычныя мерапрыемствы для захавання гэтых тэрыторый і аднаўлення экасістэм.**

АБО СКАНІРУЙЦЕ

**ЗАХОДЗЬЦЕ НА СТАРОНКУ**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце: 8(017)263-06-13**

**Станавіцеся адным з захавальнікаў, назірайце за Тэрыторыяй, важнай для птушак. Паведамляйце нам пра пагрозы для ТВП і свае назіранні!**


ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
(8017) 263-06-13
(8029) 223-06-13
(8029) 101-68-87
info@ptushki.org

www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus
www.vk.com/ptushki
www.twitter.com/ptushki

**www.ptushki.org**



Coalition Clean Baltic

BirdLife INTERNATIONAL

Сетка захавальнікаў ТВП "Брыцалавіцкая пушча" ствараецца ў рамках праекта "Развіццё і ўмацаванне сеткі захавальнікаў вакол значных водна-балотных угоддзяў" пры падтрымцы прыродаахоўнай асацыяцыі "Кааліцыя Чыстая Балтыка".

Фота: М. Дзмітранок, І. Вяршыцкая, О. Samwald, www.shutterstock.com


АПБ

Тэрыторыі, важныя для птушак

# БРЫЦАЛАВІЦКАЯ ПУШЧА



BirdLife IBA
ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Шэрая кугакаўка



Сярэдні дзяцел

## ШТО ТАКОЕ ТВП?

Найбольш эфектыўным метадам аховы большасці рэдкіх і многіх звычайных відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне каштоўных прыродных тэрыторый, неабходных для іх выжывання.

Тэрыторыя, важная для птушак (ТВП) – гэта тэрыторыя, якая адпавядае міжнародным або нацыянальным крытэрыям падтрымкі пэўнай часткі папуляцыі аднаго ці некалькіх відаў птушак падчас гнездавання, зімоўкі або міграцыі.

Зараз у праграме ТВП удзельнічаюць каля 200 краін свету, у якіх выдзелена больш за 11 000 ТВП. У Беларусі вызначаны 52 Тэрыторыі, важныя для птушак.




## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА БРЫЦАЛАВІЦКУЮ ПУШЧУ:

1 Гэта адна з нямногіх мясцін у Беларусі, дзе захаваліся вялікія масівы высокаўзроставых шыракалістых лясоў: дубраў, ліпнякоў і ясеннікаў.

2 Асаблівая каштоўнасць Брыцалавіцкай пушчы – рэліктавыя лясы адной з найбольш рэдкіх фармацый – ліпнякі, узрост якіх дасягае 150 гадоў.

3 Вялізныя стараўзроставыя лясы спрыяюць таму, што некаторыя віды птушак – такія, як сярэдні дзяцел, шэрая кугакаўка, валасяніца-белашыйка – гняздуюцца тут з высокай шчыльнасцю.



Валасяніца-белашыйка

4 У пойме ракі Вольса падчас міграцый прыпыняецца на адпачынак шмат кулікоў розных відаў – баталёны, кулікі-цекуны, кулікі-селянцы, шчогалі і інш.

5 На адным з рэліктавых ледавіковых валуноў, якія трапляюцца ў пушчанскіх нетрах, пасялілася рэдкая горная папараць – мнаганожка звычайная. Яна расце ў гарах Каўказа і Крыма, а ў нашай краіне сустракаецца ўсяго ў некалькіх месцах.



Папараць мнаганожка звычайная

## ШТО ПАГРАЖАЕ БРЫЦАЛАВІЦКАЙ ПУШЧЫ?

- Высечка высокаўзроставых шыракалістых масіваў наносіць найбольш істотны ўрон экасістэмам пушчы.
- У выніку спынення сенакашэння адкрытыя ўчасткі нізінных балот і паплаваў зарастаюць хмызнякамі, што прыводзіць да знікнення каштоўных прыродных экасістэм.
- Дачная забудова каштоўных ў прыродаахоўным плане прыбярэжных тэрыторый.
- Наведванне лясных масіваў і берагоў рэк адпачываючымі, паляўнічымі і рыбакамі – істотны фактар неспакою для жывёльнага свету пушчы.



